*У раённым краязнаўчым музеі сабраліся неабыякавыя настаўнікі з Барысава і Лунінца.*

# ГІМН ТВОРЧАСЦІ

Гэта сустрэча мела назву Міжнародная культурна-экалагічная праграма "Няхай расцвітуць пустыні" і спадарожнічала адкрыццю выставы "Пакт Рэрыха і Сцяг Міру". Госці і гаспадары дзяліліся болем душы аб павелічэнні разрыву ў адносінах паміж чалавекам і прыродай, але пры гэтым кожны расказваў аб сваім жыццёвым "подзвігу" (аналагаў гэтага слова няма ў іншых мовах) у абароне пэўнага экалагічнага, гістарычнага ці культурнага аб'екта. І гэта стала яскравым сведчаннем ісціны: калі чалавек любіць тое, чым займаецца, ён дасягне поспеху і знойдзе падтрымку ў аднадумцаў. Аб нялёгкім шляху да авалодвання метадам "гуманнай педагогікі" паведаміла выкладчыца геаграфіі гімназіі №2 г. Барысава Алена Барташэвіч. Назва яе даклада – "Выхаванне вучняў школ праз прыгажосць мастацтва і прыроды". Гэтым жа мэтам прысвячаюць сваю педагагічную дзейнасць лунінецкія настаўнікі.

Адлюстраванне намаганняў творчай сям'і Ларысы і Івана Панасюкоў – шэраг выданняў аб прыродаахоўных відах флоры і фауны нашага раёна. Практычныя дзеянні дзяцей і дарослых па ачышчэнню навакольнага асяроддзя ад варварскага забруджвання зямлі і вады занатаваў у прэзентацыі Аляксандр Хаўдзееў (СШ №2 г. Лунінца), а Эдуард Антановіч (Палеская СШ) пазнаёміў з турыстычнымі маршрутамі да прыродных багаццяў нашага краю. Выступленне намесніка дырэктара СШ №2 г. Лунінца Наталлі Бойка пазнаёміла з зараджэннем экалагічных імкненняў ліцэя, што ўвасоблена дзейнасцю навуковага таварыства вучняў "Зямляне". Праекты за даўнасцю часу не страцілі сваёй каштоўнасці, больш таго – улічаны органамі ўлады (напрыклад, аб'яўленне помнікам прыроды "каўнерыкавых соснаў", якія на мяжы XX і XXI стагоддзя даследавалі і апісалі ліцэісты).

У памяць аб 75-годдзі пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўсклалі кветкі да Кургана Бессмяротнасці... У практычнай частцы сустрэчы ўдзельнікі пазнаёміліся з заказнікам "Лунінскі" на Белым возеры і паляўнічым домікам лясгаса на Прыпяці. Вопытам работы падзяліліся і настаўнікі шэрагу іншых школ. Святочнасць праграмы, якую сваімі спевамі задалі Крысціна Збралевіч і Сяргей Місікаў, замацавалася наведваннем Цэнтра культуры і народнай творчасці ў Вульцы 1. У неабыякавых сучаснікаў, якія захоўваюць старажытныя традыцыі, знайшлося яшчэ шмат агульных тэм для абмеркавання.

**НАПАЦКАЯ. Фота аўтара.**